метны, геаграфічны, загалоўкаў, серыйных выданняў і г.д.) дае магчымасць атрымліваць інфармацыю і весці шматаспектны пошук публікацый па змесгу і форме адлюстраваных матэрыялаў.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі працягвае выдаваць штогодныя выданні: "Зводны каталог новых замежных кніг, якія паступілі ў бібліятэкі Рэспублікі Беларусь" (9 (1991 г.), 10 (1992 г.), 9 (1993 г.), 7 (1994 г.), 9 (1995 г.)) . " і "Зводны паказальнік замежных перыядычных выданняў, выпісаных бібліятэкамі Рэспублікі Беларусь..." (10 (1991 г.), 7а (1994 г.), 11 (1995 г.)), якія даюць магчымасць чытачам (асабліва навукоўцам, спецыялістам) атрымліваць інфармацыю і весці пошук замежных крыніц па ўсіх галінах ведаў, якія паступаюць у бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

У 1992 годзе Нацыянальная кніжная палата выдала рэтраспектыўны бібліяграфічны паказальнік "Летапіс часопісных артыкулаў, 1928-1933" (5 (1993 г.)) у дзвюх частках. Гэты дапаможнік з'яўляецца працягам рэтраспектыўнага бібліяграфічнага паказальніка "Беларускі перыядычны друк, 1917-1927", які быў выдадзены Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў 1928 годзе. У аснову гэтага паказальніка пакладзена "Картатэка артыкулаў, 1928-1933", якая складзена аддзелам беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У паказальнік уключаны артыкулы і іншыя матэрыялы з часопісаў, дадаткаў да газет і серыяльных выданняў тыпу "Працы", "Вучоныя запіскі", "Бюлетэні" і інш., якія выходзілі ў Беларусі ў азначаны перыяд. Праца складаецца з дзвюх частак: "Летапіс часопісных артыкулаў, 1928-1933" і "Летапіс рэцэнзій, 1928-1933", якія аб'яднаны суцэльнай нумарацыяй. Бібліяграфічныя запісы згрупаваны ў адпаведнасці з "Единой классификацией литературы для книгоиздания в СССР" (2-е выд. М., 1986).

"Летапіс часопісных артыкулаў, 1928-1933" ліквідуе лакуну ў рэтраспектыўным уліку артыкулаў і іншых матэрыялаў, надрукаваных у часопісах з 1928 па 1933 гг. (з 1934 года артыкулы з часопісаў пачалі адлюстроўвацца ў бягучым "Летапісу друку Беларусі").

В.І.Саітава

## Краязнаўчая бібліяграфія

Адбыўся значны якасны рост краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі, пашырылася і ўзбагацілася яе тэматыка. Гэтыя пленныя з'явы сталі вынікам паглыблення навуковых даследванняў многіх беларускіх тэрыторый і населеных пунктаў, жыцця і спраў іх ураджэнцаў і дзеячаў, уздыму інтарэсу да мінулага ў шырокіх слаёў насельніцтва, да асэнсавання складаных рэгіянальных праблем сучаснасці.

У сістэме краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў стабільна здзяйснялася выданне бягучых паказальнікаў новай краязнаўчай літаратуры. Рэгулярна рэгістраваліся паказальнікі, складзеныя Віцебскай і Мінскай абласнымі бібліятэкамі. У паказальніках гэтых бібліятэк адбылося значнае павелічэнне аб'ёму бібліяграфічных запісаў, як следства актывізацыі краязнаўчых публікацый. Сістэматычная групоўка, удакладненні да загалоўкаў, дапаможныя імянныя і геаграфічныя паказальнікі, пералікі распісаных перыядычных выданняў дапамогуць пры выкарыстанні паказальнікаў дасягаць высокай дакладнасці бібліяграфічнага пошуку, забяспечваюць іх зручнасць. Пажадана ў геаграфічных дапаможных паказальніках у рубрыках з

вялікай колькасцю нумароў бібліяграфічных запісаў уводзіць тэматычныя падрубрыкі.

У чарговым выпуску рэтраспектыўнага навукова-дапаможнага паказальніка "Палессе (99(1992 г.)) Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Акадэміі навук даследчыкі і спецыялісты атрымалі грунтоўнае адлюстраванне публікацый, прысвечаных комплексу праблем, звязаных з гэтым рэгіёнам за перыяд 1986-1990 гг.

Да ліку асобна выданых буйных бібліяграфічных прац адносяцца паказальнік "Роднай зямлі галасы" (1552(1993 г.)) Брэсцкай абласной бібліятэкі і біябібліяграфічны слоўнік "Сучасныя мастакі Віцебшчыны" (1892(1994 г.)) Брэсцкай абласной бібліятэкі. Паказальнік "Роднай зямлі галасы" з'яўляецца працягам папярэдніх бібліяграфічных дапаможнікаў, прысвечаных жыццю і творчасці паэтаў Брэстчыны. У адборы літаратуры дакладна вытрымана храналагічная пераемнасць выданняў. Асноўную структуру паказальніка ўтварае алфавіт персаналій. Карысна, што бібліяграфічныя апісанні твораў суправаджаюцца пералікамі рэцэнзій. Няўдала складзены да гэтага выдання геаграфічны дапаможны паказальнік: не мэтазгодна было надаваць яму функцыю, якую звычайна выконваюць паказальнікі моў.

Бібліяграфічны слоўнік "Сучасныя мастакі Віцебшчыны" адлюстроўвае развіццё жывапісу, скульптуры і другіх відаў выяўленчага мастацтва на зямлі, якая здаўна славілася мастацкай творчасцю. У дапаможніку прадстаўлены даныя аб 77 мастаках. Аб кожным з іх прыводзіцца кароткая даведка, пералік асноўных твораў і спіс літаратуры. Спосаб групоўкі бібліяграфічных запісаў у спісе - па ступені значнасці не надае бібліяграфічнай інфармацыі відавочнага рэкамендацыйнага характару, магчыма было скарыстаць фармальную групоўку. Складальнікам не растлумачана пачатковая дата адбору.

Каштоўныя, часта унікальныя краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы, прысвечаныя беларускім тэрыторыям, былі апублікаваны ў выглядзе несамастойных форм. Асабліва многа іх змяшчаюць манаграфіі, матэрыялы канферэнцый, у т.л. краязнаўчых, навукова-папулярныя і другія выданні па археалогіі, этнаграфіі, гісторыі, фальклору і другіх галінах. Для гэтых бібліяграфічных матэрыялаў характэрны глыбокі храналагічны ахоп дакументаў, іх шырокі відавы і моўны склад.

Прыкніжныя бібліяграфічныя матэрыялы дыферэнцыруюцца па мэтаваму і чытацкаму прызначэнню, значна адрозніваюцца па аб'ёму. Вялікія спісы налічваюць сотні бібліяграфічных запісаў, напрыклад, такія спісы ў кнігах Л.У.Дучыц "Браслаўскае Паазер'е ў IX-XI стст." (63(1991 г.)), В.Ф.Копытина "Археологические памятники Белыничского района Могилевской области" (81(1992г.)), А.К.Краўцэвіч "Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIУ-XУIII стст." (64(1991 г.)) і іншых. Аднак і значна меншыя па аб'ёму спісы літаратуры адлюстроўваюць каштоўныя дакументы і нярэдка адносяцца да першых спроб бібліяграфічнага асвятлення тэмы. Гэтыя матэрыялы характэрызуюцца высокай якасцю адбора дакументаў, але у некаторых з іх не пажадана апускаць асобныя элементы бібліяграфічнага апісання. Таксама важна адзначыць, што ў асобных кнігах наяўнасць паказальнікаў імёнаў і геаграфічны дазваляе аптымізаваць пошук краязнаўчай інфармацыі.

Высокаякасныя рэкамендацыйныя бібліяграфічныя матэрыялы краязнаўчага зместу сістэматычна адлюстроўваліся на старонках бюлетэня

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Новыя кнігі Беларусі" (6(1991 г.), 7(1992 г.), 6(1993 г.), 4(1994 г.)) Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Вельмі карыснымі для пошукаў краязнаўчых даных з'уляюцца гадавыя дапаможныя паказальнікі: персанальны і геаграфічны, якія друкаваліся ў дванаццатых нумарах бюлетэня. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на публікацыю аглядаў, прысвечаных раскрыццю зместа твораў краязнаўчага характара, надрукаваных у далёкім мінулым. Да іх належыць агляд часопіса "Наш край" ("Новыя кнігі Беларусі", 1993, № 4-5), спіс "Краязнаўчыя матэрыялы на старонках друку на Беларусі: (пач. XX ст. 20-я гг. XX ст.)" (2107(1994)). У апошнім з іх разглядаюцца матэрыялы з навуковых зборнікаў "Записки Северо-Западного Отдела Императорского Русского Географического Общества", "Запіскі аддзелу гуманітарных навук", "Гістарычна-археолёгічнага зборніку". Размеркаванне матэрыялаў здзейснена ў адпаведнасці з абласным дзяленнем, творы, якія адносяцца да некалькіх абласцей, адлюстраваны асобнай часткай.

Гэтыя матэрыялы спрыяюць больш аб'ектыўнаму і грунтоўнаму вывучэнню мінулага. Важна адзначыць, што Нацыянальная бібліятэка ўпершыню пачала ствараць рэкамендацыйную бібліяграфічную інфармацыю на аснове апрацоўкі літаратуры, надрукаванай у далёкім мінулым, рэдкіх выданняў, апублікованых на замежнай мове. Рэкамендацыйныя бібліяграфічныя тэксты вызначаюцца спалучэннем прыёму папулярызацыі твораў з увядзеннем чытачоў у гістарычныя рэаліі, што дапамагае забяспечыць даступнасць бібліяграфічнай інфармацыі для розных груп чытачоў-неспецыялістаў.

Сярод бібліяграфічных выданняў, прысвечаных беларускім гарадам, зарэгістраваны рэкамендацыйны спіс "Вілейка" (47(1991 г.)), выпушчаны Мінскай абласной бібліятэкай у серыі "Па гарадах нашай вобласці", "Горад і гады"(48(1991 г.)).

У развіцці персанальнага звяна краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі пераважалі традыцыйныя навукова-дапаможныя паказальнікі прац вучоных - супрацоўнікаў навукова-даследчых і вышэйшых навучальных устаноў. Выявілася новая прагрэсіўная тэндэнцыя падрыхтоўкі бібліяграфічных матэрыялаў, прысвечаных выдатным краязнаўцам. Біябібліяграфічны паказальнік прысвечаны горацкому краязнаўцу і літаратуразнаўцу У.М.Ліўшыцу (2108(1994 г.)) з нагоды яго 30-гадовай творчай працы. Унутрыкніжны "Бібліяграфічны паказальнік прац В.А.Шукевіча (1852-1919 гг.)" (2147(1994 г.)) адлюстроўвае дакументальную спадчыну воранаўскага археолага і краязнаўцы.

Штогоднікі "Паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі" (2(1991 г.), 1(1992 г.), 1(1993 г.), 1(1995 г.)) адлюстравалі вялікі масіў краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі, якая мае выключнае значэнне для забеспячэння разнастайных патрэб у ёй.

Л.І.Даніленка

## Бібліяграфічныя дапаможнікі па сацыяльных і гуманітарных навуках

У 1991-1995 гг. сістэма бібліяграфічных выданняў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі працягвала развівацца па асноўных напрамках, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ